**15 красавіка** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшло адкрыццё выставы **«Кнігазбор Храптовічаў: на шляху вяртання»**, арганізаванай сумесна дабрачынным фондам «Шчорсы і Храптовічы» і НББ. Упершыню прадстаўленыя ўнікальная сямейная перапіска XIX ст. і кнігі са знакамітай бібліятэкі Храптовічаў у Шчорсах, вернутыя з Германіі летась у лютым, і з таго часу захоўваліся ў НББ. Вяртанне адбывалася намаганнямі дабрачыннага фонду «Шчорсы і Храптовічы». Некалі кнігазбор Храптовічаў, які пачаў збіраць канцлер Іяхім Літавор Храптовіч у XVIII ст., лічыўся адной з найбагацейшых бібліятэк ва Усходняй Еўропе.

Як старажытныя кнігі, так і перапіска на французскай мове – гэта надзвычай каштоўныя помнікі свайго часу, якія дагэтуль нідзе не публікаваліся і не дэманстраваліся для публікі. У межах адкрыцця выставы адбылася афіцыйная перадача кніг і перапіскі Храптовічаў на захоўванне ў НББ.

На выставе таксама прадстаўленыя мастацкія працы студэнтаў БНТУ, якія працавалі валанцёрамі на летніках па добраўпарадкаванні маёнтка Храптовічаў у Шчорсах у 2018 – 2019 гг.

Пабачыць унікальныя экспанаты можна па 30 красавіка.

**З 16 красавіка** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» праходзіць выстава **«Всемирный день цирка»**, зладжаная галерэяй і Беларускім дзяржаўным цыркам і прысвечаная цыркавому мастацтву. Дэманструюцца экспанаты, што ілюструюць дзейнасць Белдзяржцырка: фотаздымкі нумароў і эскізы касцюмаў, цікавыя факты пра дрэсіроўшчыкаў ды інш. Дэманструецца таксама ўнікальны інтэрактыўны макет цырка, дзе можна пагледзець, як уладкаваныя манеж, балетная зала, грымёрныя, стайня і г.д. Пабачыць усё можна па 30 красавіка.




*Скарыстаная інфармацыя з паведамленняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, Музея гісторыі горада Мінска, мастацкай галерэі «Універсітэт культуры»*